ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
23.01.2026 № 20

# Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў
# «Фальклорная скарбонка»
# для I–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Фальклорная скарбонка» (далей – вучэбная праграма) прызначана для I–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 4 гады. На правядзенне факультатыўных заняткаў адводзіцца ў I–II класах – 34 гадзіны (1 гадзіна на тыдзень), III–IV класах – 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень).

3. Мэта – фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў, развіцце каштоўнаснага стаўлення да беларускай мовы, выхаванне патрыятычных пачуццяў праз знаёмства з беларускім фальклорам (творамі вуснай народнай творчасці, гульнямі, народнымі святамі і абрадамі).

4. Задачы:

развіваць слоўнікавы запас вучняў праз вывучэнне твораў вуснай народнай творчасц і, а таксама цікавасць вучняў да вывучэння беларускай мовы і культурнай спадчыны беларусаў;

фарміраваць звязнае маўленне і камунікатыўныя ўменні вучняў у розных відах дзейнасці;

выхоўваць цікавасць да нацыянальнай культуры і традыцый беларускага народа, павагу да сваёй Айчыны, агульначалавечыя, агульнакультурныя і сямейныя каштоўнасныя арыенціры, беражлівыя адносіны да прыроды.

5. Структура заняткаў, у залежнасці ад задач, якія вырашаюцца, можа быць рознай, але абавязковымі элементамі з'яўляюцца: паўтарэнне вывучанага на папярэдніх занятках матэрыялу, маўленчая размінка, камунікатыўныя сітуацыі для пашырэння маўленчага вопыту вучняў і актывізацыі іх слоўнікавага запасу, беларускія народныя гульні, творчыя заданні (дапоўні фразу, пошук слова, сінквейн, вусны партрэт, праект і іншыя) з вывучаемым матэрыялам, выніковая рэфлексія.

Змест дадзенай вучэбнай праграмы распрацаваны з улікам узроставых асаблівасцей і магчымасцей вучняў і складаецца з трох частак:

«Нас бабуля забаўляла»;

«Казачная гасцёўня»;

«Беларускія народныя святы і абрады».

Частка «Нас бабуля забаўляла» прызначана для вучняў I класа. Прадстаўлена ў асноўным малымі жанрамі вуснай народнай творчасці і беларускімі народнымі гульнямі, якія аб'яднаны агульнай тэмай

беларускага календара. Накіравана на фарміраванне тэхнікі і правільнасці гукавымаўлення, пашырэнне слоўнікавага запасу вучняў.

На працягу навучальнага года першакласнікі вывучаюць прыказкі, прымаўкі, скорагаворкі, лічылкі, знаёмяцца з асаблівасцямі святкавання Масленіцы на Беларусі і гуляюць у беларускія народныя гульні. Лагічным заканчэннем гэтай часткі з’яўляюцца адкрытыя заняткі для бацькоў «Нас бабуля забаўляла», падчас якіх вучні дэманструюць веды і ўменні за навучальны год.

Частка «Казачная гасцёўня» прызначана для вучняў II класа. Прадстаўлена беларускімі народнымі казкамі. Накіравана на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу, актывізацыю ўсіх відаў маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо) і камунікатыўных уменняў.

На працягу навучальнага года падчас заняткаў дзеці вывучаюць беларускія народныя казкі, акрамя таго, яны знаёмяцца з такімі беларускімі народнымі каляндарна-абрадавымі святамі як Каляды, Вялікдзень і Купалле. Заканчваецца частка адкрытым святочным мерапрыемствам для бацькоў «Свята казкі», дзе дзеці расказваюць і паказваюць урыўкі з вывучаных казак.

Частка «Святы і абрады беларусаў» прызначана для вучняў III–IV класаў. Прадстаўлена святамі і абрадамі беларускага земляробчага календара. Накіравана на актыўнае выкарыстанне ўсіх відаў маўленчай дзейнасці і камунікатыўных уменняў.

На працягу двух гадоў вучні не толькі больш падрабязна знаёмяцца з беларускімі традыцыямі, але і самі расказваюць пра іх бацькам і вучням падчас адкрытых мерапрыемстваў, а яшчэ рэканструююць калядны абрад «Ваджэнне казы», праводзяць святочныя мерапрыемствы «Масленіца», «Вялікдзень» для вучняў і бацькоў. Заканчваецца частка фестывалем «Беларускія народныя святы і абрады», дзе дзеці расказваюць бацькам пра народныя святы і абрады земляробчага календара.

6. Асноўнымі метадамі і прыёмамі навучання з’яўляюцца:

славесныя (апавяданне і чытанне фальклорных твораў, элементарны моўны аналіз твораў, дыялогі, завучванне на памяць малых жанраў вуснай народнай творчасці);

наглядна-слыхавыя (славесная і зрокавая нагляднасць);

інтэрактыўныя (беларускія народныя гульні, драматызацыя) і іншыя метады.

На занятках разам з франтальнымі і індывідуальнымі формамі навучання і выхавання неабходна выкарыстоўваць групавую работу, работу ў парах, якія садзейнічаюць камунікатыўнаму ўзаемадзеянню вучняў. Падчас заняткаў вучні заўсёды павінны знаходзіцца ў розных відах дзейнасці: маўленчай, камунікатыўнай, гульнёвай ці творчай, якія

змяняюць адна другую.

Рэкамендуецца арганізоўваць такія разнастайныя формы, як заняткі-гульні, заняткі-святы, выставы праектаў, наведванне тэатральных пастаноў, ранішнікі, конкурсы і іншыя.

Настаўнік мае права ўнесці пэўныя карэктывы ў змест і структуру заняткаў у залежнасці ад маўленчай падрыхтаванасці вучняў і іх магчымасцей, рэгіянальных фальклорных асаблівасцей.

7. У выніку засваення зместу дадзенай вучэбнай праграмы:

7.1. вучні I класа павінны:

ведаць:

вывучаныя скорагаворкі, лічылкі, прыказкі пра каляндарныя месяцы;

правілы гукавымаўлення;

назвы месяцаў беларускага календара;

беларускія народныя гульні «Агароднік», «Мядзведзь на бары», «Заінька», «Прэла-гарэла», «Замарожаныя», «Каляда», «Кошка і мышка», «Фарбы», «Гарлачык», «Лянок»;

умець:

вымаўляць вывучаныя скорагаворкі;

успрымаць на слых і разумець прыказкі і прымаўкі;

правільна вымаўляць спецыфічныя беларускія гукі;

выкарыстоўваць словы ў адпаведных ім значэннях;

выкарыстоўваць вывучаныя лічылкі ў гульнях і гульнёвых сітуацыях;

7.2. вучні II класа павінны:

ведаць:

вывучаныя беларускія народныя казкі;

правілы ўжывання моўных адзінак і пабудовы сказаў;

вывучаныя прыказкі і прымаўкі пра чалавечыя адносіны, сямейны лад, сяброўства, працу, розум;

характэрныя асаблівасці святкавання беларускіх народных каляндарна-абрадавых святаў Каляды, Вялікдзень, Купалле;

умець:

ужываць прыказкі і прымаўкі ў пэўных маўленчых сітуацыях;

выразна чытаць беларускія народныя казкі;

адказваць на пытанні па змесце твора;

правільна будаваць сказы і выкарыстоўваць словы ў адпаведных ім значэннях;

наладжваць гульні з выкарыстаннем лічылак;

7.3. вучні III класа павінны:

ведаць:

вывучаныя прыказкі і прымаўкі;

правілы ўзаемадзення ў гульнёвых сітуацыях: пастаноўка пытання,

пабудова дыялога;

назвы асноўных народных каляндарна-абрадавых святаў беларусаў: Каляды, Масленіца, Вялікдзень, Сёмуха, Купалле, Спас, Багач;

характэрныя асаблівасці святкавання народных каляндарна-абрадавых святаў: Вялікдзень, Сёмуха, Спас, Багач;

умець:

выкарыстоўваць у жыццёвых абставінах прыказкі і прымаўкі;

прымаць удзел у дыялогах з улікам сітуацыі пад кіраўніцтвам настаўніка;

будаваць простыя вусныя выказванні на зададзеную тэму па алгарытме, па плане;

прымаць удзел у тэатралізаваных гульнях пра каляндарна-абрадавыя святы Каляды, Масленіца;

7.4. вучні IV класа павінны:

ведаць:

назвы народных каляндарна-абрадавых святаў беларусаў;

правілы пабудовы вусных выказванняў;

сэнс і характэрныя асаблівасці святкавання святаў земляробчага календара;

умець:

будаваць невялікія вусныя выказванні пра беларускія народныя каляндарна-абрадавыя святы з улікам літаратурных норм пад кіраўніцтвам настаўніка;

прымаць удзел у калядным абрадзе «Ваджэнне казы»;

прымаць удзел у тэатралізаваных гульнях пра народнае каляндарна-абрадавае свята Вялікдзень і беларускія народныя святы і абрады.

# ГЛАВА 2
# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## I клас
## (34 гадзіны, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)
## «Нас бабуля забаўляла»

### Бабуліны скарбы (1 гадзіна)

Бабуліна скарбонка: прыказкі, прымаўкі, прыкметы, скорагаворкі, лічылкі, загадкі. Сучасны і народны каляндар. Поры года. Загадкі пра поры года: восень, зіма, вясна, лета.

Матэрыялы для завучвання на памяць: скорагаворка.

### Восень – на дзень пагод восем (1 гадзіна)

Восеньскія загадкі. Назвы месяцаў восені. Прыказкі і прымаўкі пра восень.

Матэрыялы для завучвання на памяць: лічылка, прыказкі і прымаўкі пра восень, назвы месяцаў восені.

### Верасень лета чырвонае праводзіць, восень сустракае (3 гадзіны)

Верасень, паходжанне назвы. Прыказкі, прымаўкі, прыкметы пра верасень. Восень у агародзе. Загадкі пра агародніну. Гульня «Агароднік».

Матэрыялы для завучвання на памяць: скорагаворка, прыказкі і прымаўкі пра верасень, назвы агародніны.

### Кастрычнік зямлю беліць, а лес залоціць (3 гадзіны)

Кастрычнік, паходжанне назвы. Прыказкі, прымаўкі, прыкметы пра кастрычнік. Восень у лесе. Загадкі-рыфмаванкі «У восеньскім лесе». Гульня «Мядзведзь на бары».

Матэрыялы для завучвання на памяць: скорагаворка, прыказкі і прымаўкі пра кастрычнік, лічылка.

### У лістападзе гола ў садзе (3 гадзіны)

Лістапад, паходжанне назвы. Прыказкі, прымаўкі, прыкметы пра лістапад. Восень у садзе. Загадкі пра садавіну. Гульня «Прэла-гарэла».

Матэрыялы для завучвання на памяць: скорагаворка, прыказкі і прымаўкі пра лістапад, назвы садавіны.

### Зімовы дзянёк, што камароў насок (1 гадзіна)

Зімовыя загадкі. Назвы месяцаў зімы. Прыказкі і прымаўкі пра зіму.

Матэрыялы для завучвання на памяць: прыказкі і прымаўкі пра зіму,

лічылка, назвы месяцаў зімы.

Снежань зіму пачынае, а год сканчае (3 гадзіны)

Снежань, паходжанне назвы. Прыказкі, прымаўкі, прыкметы пра снежань. Загадкі пра ежу. Беларускія народныя стравы. Гульня «Замарожаныя».

Матэрыялы для завучвання на памяць: скорагаворка, прыказкі і прымаўкі пра снежань, назвы беларускіх страў.

Студзень – году пачатак, зіме палавіна (3 гадзіны)

Студзень, паходжанне назвы. Прыказкі, прымаўкі, прыкметы пра студзень. Загадкі пра хатнія рэчы. Гульня «Каляда».

Матэрыялы для завучвання на памяць: лічылка, скорагаворка, прыказкі і прымаўкі пра студзень, назвы хатніх рэчаў.

Завірухі ды мяцелі ў лютым наляцелі (3 гадзіны)

Люты, паходжанне назвы. Прыказкі, прымаўкі, прыкметы пра люты. Загадкі пра зімовае надвор’е і з’явы прыроды. Гульня «Заінька».

Матэрыялы для завучвання на памяць: скорагаворка, прыказкі і прымаўкі пра люты, назвы з’яў прыроды.

Масленіца-палізуха сыр і масла палізала (1 гадзіна)

Масленіца. Масленічны тыдзень. Асаблівасці святкавання. Прыказкі і прымаўкі пра Масленіцу.

Матэрыялы для завучвання на памяць: прыказкі і прымаўкі пра Масленіцу.

Вясною работы ад нядзелі да суботы (1 гадзіна)

Назвы месяцаў вясны. Прыказкі і прымаўкі пра вясну. Загадкі пра веснавыя з’явы прыроды.

Матэрыялы для завучвання на памяць: лічылка, прыказкі і прымаўкі пра веснавыя з’явы прыроды, назвы месяцаў вясны.

Сакавік часам снегам сее, а часам сонцам грэе (2 гадзіны)

Сакавік, паходжанне назвы. Прыказкі, прымаўкі, прыкметы пра сакавік. Загадкі пра свойскіх жывёл і птушак. Гульня «Кошка і мышка».

Матэрыялы для завучвання на памяць: скорагаворка, прыказкі і прымаўкі пра сакавік, назвы свойскіх жывёл і птушак.

Красавіцкі ручай зямлю будзіць (2 гадзіны)

Красавік, паходжанне назвы. Прыказкі, прымаўкі, прыкметы пра

красавік. Вясновыя фарбы. Гульня «Фарбы».

Матэрыялы для завучвання на памяць: скорагаворка, прыказкі і прымаўкі пра красавік, назвы фарбаў.

Май зямлю грэе, а сіверам вее (2 гадзіны)

Май, паходжанне назвы. Прыказкі, прымаўкі, прыкметы пра май. Веснавыя кветкі. Гульня «Гарлачык».

Матэрыялы для завучвання на памяць: скорагаворка, лічылка, прыказкі і прымаўкі пра май, назвы кветак.

Летні дзень зіму корміць (2 гадзіны)

Назвы месяцаў лета: чэрвень, ліпень, жнівень. Паходжанне назваў. Прыказкі і прымаўкі пра летнія месяцы. Лён – сімвал Беларусі, ільняныя вырабы. Гульня «Лянок».

Матэрыялы для завучвання на памяць: скорагаворка, прыказкі і прымаўкі пра летнія месяцы.

Падагульняльныя заняткі «Нас бабуля забаўляла» (1 гадзіна)

Матэрыялы для паўтарэння: назвы месяцаў беларускага календара. Прыказкі, прымаўкі пра каляндарныя месяцы, загадкі пра поры года Беларускія народныя гульні. Скорагаворкі.

Свята «Нас бабуля забаўляла» (1 гадзіна)

Тэатралізаваныя гульні з вывучанымі скорагаворкамі, прыказкамі, прымаўкамі пра каляндарныя месяцы, загадак пра поры года, беларускіх народных гульняў.

Рэзерв (1 гадзіна)

## II клас
## (34 гадзіны, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)
## «Казачная гасцёўня»

У госці да казкі (1 гадзіна)

Захавальнік казак – Дзед-Барадзед. Казачная віктарына: казкі народаў свету. Беларускія народныя казкі.

Матэрыялы для паўтарэння: скорагаворка, лічылка, гульня «Мядзведзь на бары».

Беларуская народная казка

«Коцік Петрык і Мышка» (3 гадзіны)

Загадкі пра ката і мышку. Слуханне казкі. Лексічная праца: гумно, куточак, зашамацела. Разбор і абмеркаванне зместу казкі. Выразнае чытанне казкі.

Прыказкі пра чалавечыя адносіны. Падзел казкі на часткі, складанне плана. Чытанне казкі па ролях. Падбор азначэнняў для характарыстыкі герояў казкі.

Вуснае апавяданне пра герояў казкі. Чытанне тэксту па ролях з лялькамі. Інсцэніраванне ўрыўка казкі.

Матэрыялы для паўтарэння: скорагаворка, лічылка, гульня «Кошка і мышка».

Беларуская народная казка
«Вол і асёл» (2 гадзіны)

Слуханне казкі. Лексічная праца: вол, ярмо, хлеў, кульгаць, араць, патыліца. Чытанне казкі. Разбор і абмеркаванне зместу казкі. Гульня «Ліскі». Прыказкі пра сяброўства і чалавечыя адносіны.

Падзел казкі на часткі, складанне плана. Падбор азначэнняў для характарыстыкі герояў казкі. Вуснае апавяданне пра герояў казкі. Чытанне казкі па ролях.

Матэрыялы для паўтарэння: скорагаворка, лічылка.

Беларуская народная казка
«Жуоавель і чапля» (2 гадзіны)

Слуханне казкі. Лексічная праца: маркотна, сваты, маецца. Чытанне казкі. Разбор і абмеркаванне зместу казкі. Гульня «Журавель». Прыказкі чалавечыя адносіны.

Падзел казкі на часткі, складанне плана. Падбор азначэнняў для характарыстыкі герояў казкі. Вуснае апавяданне пра герояў казкі. Чытанне казкі па ролях.

Матэрыялы для паўтарэння: скорагаворка, лічылка.

Беларуская народная казка
«Пчала і муха» (3 гадзіны)

Загадкі пра пчалу і муху. Слуханне казкі. Лексічная праца: конік, небарака, вашчына, гаманіць. Разбор і абмеркаванне зместу казкі. Выразнае чытанне казкі.

Прыказкі пра працу і чалавечыя адносіны. Падзел казкі на часткі, складанне плана. Чытанне казкі па ролях. Падбор азначэнняў для характарыстыкі герояў казкі.

Вуснае апавяданне пра герояў казкі. Чытанне тэксту па ролях з

лялькамі. Інсцэніраванне ўрыўка казкі.

Матэрыялы для паўтарэння: скорагаворка, лічылка, гульня «Прэлагарэла».

Беларуская народная казка
«Лёгкі хлеб» (3 гадзіны)

Слуханне казкі. Лексічная праца: касец, раіць, баранаваць, красаваць, сноп, млын, выган, купіна, лагчына. Разбор і абмеркаванне зместу казкі. Чытанне казкі.

Прыказкі пра працу. Падзел казкі на часткі, складанне плана. Выразнае чытанне казкі. Падбор азначэнняў для характарыстыкі герояў казкі.

Вуснае апавяданне пра герояў казкі. Чытанне тэксту па ролях. Інсцэніраванне ўрыўка казкі.

Матэрыялы для паўтарэння: скорагаворка, лічылка, гульня «Замарожаныя».

Абрады беларусаў на Каляды (2 гадзіны)

Каляды. Асаблівасці святкавання. Куцця: посная, багатая, вадзяная. Прыказкі і прымаўкі пра Каляды.

Калядоўшчыкі. Калядная зорка. Калядны абрад «Ваджэнне казы». Сустрэча калядоўшчыкаў.

Матэрыялы для паўтарэння: скорагаворка, лічылка, гульня «Каляда».

Беларуская народная казка
«Сабака-паляўнічы» (3 гадзіны)

Слуханне казкі. Лексічная праца: вартаваць, рамяство, наедак, паляваць, дробязь. Разбор і абмеркаванне зместу казкі. Чытанне казкі.

Прыказкі пра працу і розум. Падзел казкі на часткі, складанне плана. Выразнае чытанне казкі. Падбор азначэнняў для характарыстыкі герояў казкі. Гульня «Лавіць куры».

Вуснае апавяданне пра герояў казкі. Чытанне тэксту па ролях з лялькамі. Інсцэніраванне ўрыўка казкі.

Матэрыялы для паўтарэння: скорагаворка, лічылка.

Беларуская народная казка
«Зайчыкава хатка» (3 гадзіны)

Загадкі пра лісу, мядзведзя. Слуханне казкі. Лексічная праца: растаць, сцерагчыся, дзюбануць. Разбор і абмеркаванне зместу казкі. Чытанне казкі.

Прыказкі пра сяброўства. Падзел казкі на часткі, складанне плана. Выразнае чытанне казкі. Падбор азначэнняў для характарыстыкі герояў

казкі.

Вуснае апавяданне пра герояў казкі. Чытанне тэксту па ролях. Інсцэніраванне ўрыўка казкі.

Матэрыялы для паўтарэння: скорагаворка, лічылка, гульня «Заінька».

Беларуская народная казка
«Вучоны рак» (3 гадзіны)

Слуханне казкі. Лексічная праца: гаманіць, з'ехаць з глузду, спрытны, араты, маёнтак, кіпень. Разбор і абмеркаванне зместу казкі. Чытанне казкі.

Прыказкі пра розум і чалавечыя адносіны. Падзел казкі на часткі, складанне плана. Выразнае чытанне казкі. Падбор азначэнняў для характарыстыкі герояў казкі.

Вуснае апавяданне пра герояў казкі. Чытанне тэксту па ролях з лялькамі. Інсцэніраванне ўрыўка казкі.

Матэрыялы для паўтарэння: скорагаворка, лічылка, гульня «Агароднік».

Беларуская народная казка
«Мена» (3 гадзіны)

Слуханне казкі. Лексічная праца: узяць пад пахі, сметнік, качарга. Разбор і абмеркаванне зместу казкі. Чытанне казкі.

Прыказкі пра розум. Падзел казкі на часткі, складанне плана. Выразнае чытанне казкі. Падбор азначэнняў для характарыстыкі герояў казкі.

Вуснае апавяданне пра герояў казкі. Чытанне тэксту па ролях. Інсцэніраванне ўрыўка казкі.

Матэрыялы для паўтарэння: скорагаворка, лічылка, гульня «Гарлачык».

Абрады беларусаў на Вялікдзень (1 гадзіна)

Вялікдзень. Вербніца. Чысты чацвер. Асаблівасці святкавання. Роспіс яек: крашанка, пісанка. Валачобнікі. Прыказкі і прымаўкі пра Вялікдзень.

Падагульняльныя заняткі «Казачная гасцёўня» (2 гадзіны)

Матэрыялы для паўтарэння: прыказкі і прымаўкі пра чалавечыя адносіны, сямейны лад, сяброўства, працу, розум. Інсцэніраванне ўрыўкаў казак.

Выбар урыўкаў для мерапрыемства «Свята казкі»

Свята казкі (1 гадзіна).

Паказ урыўкаў вывучаных казак.

Абрады беларусаў на Купалле (1 гадзіна)

Купалле. Асаблівасці святкавання. Сімвалы купальскага свята. Купальская ноч. Павер'і. Прыказкі і прымаўкі пра Купалле.

Рэзерв (1 гадзіна)

## III клас
(35 гадзін, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)
«Святы і абрады беларусаў»

### Беларуская народныя святы і абрады (1 гадзіна)

Традыцыі. Народныя традыцыі. Народныя святы. Беларускія народныя каляндарна-абрадавыя святы. Кола святаў земляробчага календара.

### Летнія беларускія народныя каляндарна-абрадавыя святы (1 гадзіна)

Летнія беларускія народныя каляндарна-абрадавыя святы: Сёмуха, Купалле, Зажынкі, Дажынкі, Спас. Агульныя звесткі пра час святкавання, назву, сэнс і значэнне святаў.

Матэрыялы для паўтарэння: Купалле. Асаблівасці святкавання. Сімвалы купальскага свята. Купальская ноч.

Матэрыялы для вуснага апавядання: Папараць-кветка. Павер’і. Прыказкі і прымаўкі пра Купалле.

### Дажынкі (1 гадзіна)

Дажынкі. Час святкавання. Асаблівасці. Сімвалы свята: «Барада», дажынкавы вянок.

### Спас (3 гадзіны)

Спас: Мядовы, Яблычны (Вялікі), Хлебны (Арэхавы). Асаблівасці святкавання. Народныя прыкметы. Прыказкі і прымаўкі пра Спас.

Матэрыялы для завучвання на памяць: народныя прыкметы, прыказкі і прымаўкі пра Спас.

Матэрыялы для вуснага апавядання: праект «Спас».

### Восеньскія беларускія народныя каляндарна-абрадавыя святы (1 гадзіна)

Восеньскія беларускія народныя каляндарна-абрадавыя святы: Багач, Узвіжанне, Пакровы, Дзяды. Агульныя звесткі пра час святкавання, назву, сэнс і значэнне святаў.

Матэрыялы для вуснага апавядання: агульныя звесткі пра Багач, Узвіжанне, Пакровы, Дзяды.

### Багач (3 гадзіны)

Багач. Тлумачэнне каляндарна-абрадавага свята і яго назвы. Асаблівасці святкавання. Сімвал свята: «Багач». Прыказкі і прымаўкі пра Багач.

Матэрыялы для завучвання на памяць: прыказкі і прымаўкі пра свята

Багач.

Матэрыялы для вуснага апавядання: вусны малюнак «Як беларусы святкавалі Багач».

Зімовыя беларускія народныя каляндарна-абрадавыя святы (1 гадзіна)

Зімовыя беларускія народныя каляндарна-абрадавыя святы: Каляды, Зімовыя святкі, Вадохрышча. Агульныя звесткі пра час святкавання, назву, сэнс і значэнне святаў.

Матэрыялы для паўтарэння: абрады беларусаў на Каляды.

Вячоркі (3 гадзіны)

Падрыхтоўка да Калядаў. Саламяныя «павукі», шчэпавая птушка-абярэг, выцінанка. Ёлка.

Вераваннні, звязаныя са снегам, Марозам (Дзедам Марозам, Ледзяным Дзедам), Зюзяй.

Гульня «Яшчур».

Матэрыялы для вуснага апавядання: Саламяныя «павукі», шчэпавая птушка-абярэг, выцінанка.

Каляды (4 гадзіны)

Матэрыялы для паўтарэння: прыказкі і прымаўкі пра Каляды. Каляды: асаблівасці святкавання. Калядоўшчыкі. Калядны абрад «Ваджэнне казы». Сустрэча калядоўшчыкаў.

Калядныя прыкметы. Хаджэнні з мядзведзем, цыганамі.

Матэрыялы для вуснага апавядання: тэатралізаваная гульня «Каляды на Беларусі».

Веснавыя беларускія народныя каляндарна-абрадавыя святы (1 гадзіна)

Веснавыя беларускія народныя каляндарна-абрадавыя святы: Масленіца, Гуканне вясны, Вялікдзень, Радаўніца. Агульныя звесткі пра час святкавання, назву, сэнс і значэнне святаў.

Матэрыялы для вуснага апавядання і агульныя звесткі пра Масленіцу, Гуканне вясны, Вялікдзень, Радаўніцу.

Масленіца (4 гадзіны)

Матэрыялы для паўтарэння: Масленіца, асаблівасці святкавання, масленічны тыдзень, прыказкі і прымаўкі пра Масленіцу.

Гульні і забавы на Масленіцу.

Матэрыялы для вуснага апавядання: правядзенне тэматычнага мерапрыемства для вучняў і бацькоў «Прыйшла да нас Масленіца».

Гуканне вясны (2 гадзіны)

Гуканне вясны. Асаблівасці святкавання. Песні-вяснянкі. Карагоды. Народныя прыкметы. Птушкі (чырачкі), выпечаныя з цеста.

Матэрыялы для вуснага апавядання: Гуканне вясны: асаблівасці святкавання.

Вялікдзень (3 гадзіны)

Матэрыялы для паўтарэння: Вербніца, Чысты чацвер, Вялікдзень: асаблівасці святкавання. Традыцыйны роспіс яек. Валачобнікі. Прыказкі і прымаўкі пра Вялікдзень.

Народныя прыкметы. Велікодныя гульні: «У біткі», «Качанне яек», «На паляўнічы спрынт».

Матэрыялы для вуснага апавядання: апавяданне пра велікодныя гульні.

Радаўніца (1 гадзіна)

Радаўніца: тлумачэнне назвы, сэнс свята, вераванні, асаблівасці святкавання.

Матэрыялы для вуснага апавядання: праект «Пасхальныя традыцыі маёй сям’і».

Сёмуха (3 гадзіны)

Сёмуха: тлумачэнне назвы, сэнс свята. Асаблівасці святкавання. Русальны тыдзень. Абрад «Кумаванне» для дзяўчынак.

Матэрыялы для вуснага апавядання: вусны партрэт «Мая сяброўка».

Купалле (2 гадзіны)

Матэрыялы для паўтарэння: Купалле: асаблівасці святкавання, сімвалы купальскага свята, купальская ноч, павер’і, прыказкі і прымаўкі пра Купалле.

Вогнішча. Купальскі вянок. Папараць-кветка. Купальскія зёлкі.

Матэрыялы для вуснага апавядання: апавяданне пра лекавыя расліны.

Падагульняльныя заняткі
«Беларускія народныя святы і абрады» (1 гадзіны)

Матэрыялы для паўтарэння: кола святаў, восеньскія, зімовыя, веснавыя, летнія народныя каляндарна-абрадавыя святы беларусаў.

Матэрыялы для вуснага апавядання: апавяданне пра каляндарна-абрадавае свята, якое зацікавіла.

Рэзерв (1 гадзіна)

IV клас
(35 гадзін, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)
«Беларускія народныя святы і абрады»

Беларускія народныя святы і абрады (1 гадзіна)

Матэрыялы для паўтарэння: кола святаў, народныя святы беларусаў.

Народныя святы: сямейныя (сямейна-абрадавыя), земляробчыя (каляндарна-абрадавыя). Абрады.

Матэрыялы для вуснага апавядання: загадка-апісанне пра народнае свята.

Сямейныя святы і абрады (2 гадзіны)

Сямейныя святы і абрады, якія дайшлі да нашых дзён: нараджэнне, вяселле. Агульныя звесткі сэнс і значэнне святаў. Культ сям'і.

Матэрыялы для вуснага апавядання: праект «Традыцыі нашай сям'і».

Земляробчыя святы і абрады беларусаў (1 гадзіна)

Матэрыялы для паўтарэння: летнія, восеньскія, веснавыя, зімовыя святы.

Культ прыроды, зямлі, сонца, хлеба. Святы збору ўраджаю, зімовага адпачынку, абуджэння прыроды, новага ўраджаю.

Народныя святы збору ўраджаю (4 гадзіны)

Святы збору ўраджаю: Зажынкі, Дажынкі, Спас, Багач. Асаблівасці святкавання.

Абрадавыя этапы жніва: пачатковы – Зажынкі і заключны – Дажынкі. Зажынкі: час святкавання, асаблівасці, сімвал свята – зажынкавы «гаспадар» («дзед»).

Матэрыялы для паўтарэння: народныя прыкметы, прыказкі і прымаўкі пра Спас, Багач.

Матэрыялы для вуснага апавядання: Дажынкі, Спас: Мядовы, Яблычны, Хлебны (Арэхавы), Багач.

Пакровы (2 гадзіны)

Тлумачэнне свята і яго назвы. Асаблівасці святкавання. Вялікая вясельніца. Народныя прыкметы. Сучаснае тлумачэнне свята.

Матэрыялы для завучвання на памяць: народныя прыкметы.

Дзяды (1 гадзіна)

Дзяды. Тлумачэнне свята і яго назвы. Асаблівасці святкавання.

«Дзед».

Матэрыялы для вуснага апавядання: Значэнні слова «Дзед».

Зімовыя народныя святы і абрады (1 гадзіна)

Матэрыялы для вуснага апавядання: Каляды, Зімовыя святкі, Вадохрышча. Агульныя звесткі пра час святкавання, назву, сэнс і значэнне святаў.

Матэрыялы для паўтарэння: вячоркі.

Каляды (3 гадзіны)

Матэрыялы для паўтарэння: прыказкі і прымаўкі пра Каляды. Каляды: асаблівасці святкавання. Калядоўшчыкі. Традыцыя калядавання: калядная зорка, хаджэнне з казой. Сустрэча калядоўшчыкаў.

Святкаванне Калядаў у каталіцкім (25 снежня) і праваслаўным (7 студзеня) хрысціянстве.

Матэрыялы для вуснага апавядання: драматызацыя каляднага абраду «Ваджэнне казы».

Зімовыя святкі (4 гадзіны)

Матэрыялы для паўтарэння: Мароз (Дзед Мароз, Ледзяны Дзед), Зюзя.

Зімовыя святкі: перыяд ад поснай куцці (6 студзеня) да Вадохрышча. Батлейка. Калядныя гульні: «Яшчур», «Жаніцьба Цярэшкі».

Калядныя абрады: «Куры», «Цягнуць Каляду на дуба».

Матэрыялы для вуснага апавядання: Батлеечны спектакль.

Народныя святы і абрады сустрэчы вясны (5 гадзін)

Святы сустрэчы вясны Грамніцы, Масленіца, Гуканне вясны, Саракі, Камаедзіца, Дабравешчанне. Агульныя звесткі пра час святкавання, назву, сэнс і значэнне святаў.

Матэрыялы для паўтарэння: веснавыя народныя святы Масленіца, Гуканне вясны.

Грамніцы (Стрэчанне). Асаблівасці святкавання. Народныя прыкметы. Грамнічныя свечкі.

Саракі (прысвятак). Асаблівасці святкавання: выпяканне сарака птушак, «саракоўка» – манета ў адной з птушак .

Камаедзіца. Асаблівасці святкавання. Мядзведзь.

Дабравешчанне. Асаблівасці святкавання. «Галёпы» – пшанічны каравай ў выглядзе бусла.

Матэрыялы для вуснага апавядання: праект «Народныя святы сустрэчы вясны».

Вялікдзень (3 гадзіны)

Матэрыялы для паўтарэння: Вербніца, Вялікдзень. Прыказкі і прымаўкі пра Вялікдзень. Народныя прыкметы. Велікодныя гульні.

Святкаванне Вялікадня ў каталіцкім (паміж 4 сакавіка і 25 красавіка) і праваслаўным (паміж 22 сакавіка і 8 мая) хрысціянстве.

Матэрыялы для вуснага апавядання: тэатралізаваная гульня «Ужо недалечка чырвонае яечка».

Юр’е (1 гадзіна)

Юр’е: тлумачэнне назвы, сэнс свята, вераванні, асаблівасці святкавання. Народныя прыкметы.

Сёмуха (1 гадзіна)

Матэрыялы для паўтарэння: Асаблівасці святкавання. Русальны тыдзень.

Матэрыялы для вуснага апавядання: абрад «Кумаванне» для дзяўчынак.

Абрад «Ваджэнне куста».

Купалле (2 гадзіны)

Матэрыялы для паўтарэння: асаблівасці святкавання, павер’і, прыказкі і прымаўкі пра Купалле.

Матэрыялы для вуснага апавядання: сімвалы купальскага свята.

Купальскі квэст: пошук папараць-кветкі, выкананне розных заданняў на тэму «Купалле».

Падагульняльныя заняткі
«Беларускія народныя святы і абрады» (2 гадзіны)

Матэрыялы для паўтарэння: кола святаў, святы збору ўраджаю, зімовага адпачынку, абуджэння прыроды, новага ўраджаю.

Матэрыялы для вуснага апавядання: апавяданне пра народныя святы і абрады.

Фестываль «Беларускія народныя святы і абрады» (1 гадзіна)

Тэатралізаваная гульня пра святы і абрады земляробчага календара.

Рэзерв (1 гадзіна)